# ПАЛІНА КОРНЕВА



## Шлях дадому

Нарыс

Корнева Паліна нарадзілася 9 лістапада 2004 года ў Барысаве. Скончыла Беларускамоўную гімназію № 2 г. Барысава. Цяпер студэнтка другога курса лячэбнага факультэта Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта. Лаўрэат Рэспубліканскага літаратурнага конкурсу студэнтаў і школьнікаў «БрамаМар», дыпламант Рэспубліканскага конкурсу даследчых работ па беларускай мове і літаратуры і Мінскага абласнога конкурсу літаратурных твораў сярод школьнікаў «Лірнік Міншчыны».

> Калі напачатку п'есы на сцяне вісіць стрэльба, то да канца п'есы яна павінна стрэліць.
>
> *А. П. Чэхаў*

Напэўна, у кожнага чалавека ёсць песні, пад якія ён успамінае мінулае. Музыка наогул такі папулярны феномен толькі таму, што дапамагае чалавеку прайсці праз складаныя сітуацыі ў жыцці, пераасэнсаваць іх. З яе дапамогай мы выхопліваем момант з хуткай плыні рэчаіснасці. Чытала нядаўна кнігу аднаго разумнага дзядзькі з нейкага амерыканскага ўніверсітэта: «Наш мозг вельмі музыкальны». Калі паглядзець на сённяшняе мінскае метро, нельга заўважыць падлетка без навушнікаў. Я вельмі люблю назіраць за людзьмі збоку. Цікавая думка: вось, зараз перад табою стаіць чалавек і для цябе ён толькі спадарожнік. Заўтра ты нават не ўспомніш яго твар, а ён жа жыве... У яго таксама ёсць дом, таксама ёсць нехта дарагі, да каго ён спяшаецца. Наша эпоха — малебен індывідуальнасці, прычым бяздарны і няшчыры. Мы праслаўляем індывідуальнасць ва ўсім: пачынаючы ад думак і заканчваючы колерам валасоў. З аднаго боку, гэта добра. «Мы маем права быць рознымі!» — чуецца з усіх бакоў. І гэта правільна. Але чамусьці я стаю ў метро разам з дзяўчатамі, на якіх апрануты такія ж шырокія штаны, як на мне. Шмат хто трымае ў руках не проста сродак сувязі, а айфон апошняй мадэлі. І ва ўсіх у вушах навушнікі, а позірк — удалечыню. Іншы раз, адарваўшыся ад уласных думак, я заўважаю гэты доўгі позірк сваіх равеснікаў, накіраваны кудысьці ўбок ці ўніз. Мы глядзім у столь, на свае ж боты — толькі б не на людзей. Некультурна. Музыка ў навушніках стварае новую рэальнасць ці вяртае ў старую. Янаназапашвае ўспаміны і потым раззбройваецца імі ў нашым целе. У пакаленні атэістаў музыка стала Богам. Толькі ў адрозненне

# ЯЎГЕН БОДРЫКАЎ



## Свет чароўны

Вершы

Бодрыкаў Яўген нарадзіўся 6 лютага 1997 года ў Оршы. Скончыў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, дзе ў дадзены момант працягвае навучанне ў аспірантуры. Друкаваўся ў газеце «Літаратура і мастацтва» і альманаху «аБДУмана».

### Чарговая восень з табой

Настаў той час, калі вакол
Адно старое лісце.
Чарговы дзень, працоўны стол
Ды згубленае выйсце.

А мы вядзём бясконцы бой
З праціўнікам-паперай.
Чарговы раз, як я табой
Жыву, люблю без меры.

Чарговы дзень адшчыраваць,
Ляцець, пакуль цямнее,
Каб зноў цябе пацалаваць!
І шэры свет ярчэе.

Чарговы ціхі твой адказ
Не можа быць адмоўным...
Я ўваскрасаю кожны раз,
А значыць — свет чароўны!

### Шлях разважання

Я спынюся на станцыі дальняй,
Дзе вакол толькі поле ды лес.
Лёс даводзіць да кропкі той крайняй,
Дзе ты шчыры і стомлены спрэс.

Я пайду невядомым мне шляхам
Па вільготных і доўгіх палях.
І свяшчэнным падыхаю пахам,
Быццам я благаслаўлёны манах.

Усміхнуся і сонцу, і хмарам
Ды сустрэну паветра і снег.
Не паддамся я здрадніцкім чарам,
Перад Богам свой выкуплю грэх.

А пасля, калі сонца за хмарай
Пахаваецца пахмурным днём,
Я прыйду, задаволены марай,
Я вярнуся у сцішаны дом.

# ВАЛЕРЫЯ ГАЎРУКОВІЧ



## На крылах бусла

Апавяданне

Гаўруковіч Валерыя нарадзілася 30 снежня 2001 года ў Магілёве. Скончыла факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта па спецыяльнасці «літаратурная работа (творчасць)». Журналісцкі дэбют адбыўся ў газеце «Прыдняпроўская ніва». Публіцыстычныя і крытычныя артыкулы друкаваліся ў газетах «Літаратура і мастацтва», «Культура», часопісах «На экранах», «Мир фантастики».

Раней Аля думала, што холад — самая страшная напасць на свеце. Цяпер яна да яго прывыкла. Дзед Мікіта некалькі разоў спрабаваў растлумачыць ёй, як растопліваць печ, але ўсе яго словы зліваліся ў незразумелы набор гукаў, таму Аля не чапала дровы і заўсёды замярзала да вяртання дзеда дадому. Ён будзіў яе на досвітку, карміў салодкай кашай і сыходзіў на працу, асцярожна прыкрываючы ўваходныя дзверы. Яго рыпучы голас заставаўся ў яе вушах, і з кожным днём Аля разбірала ўсё больш знаёмых слоў, быццам бы зноўку вучылася разумець чалавечую гаворку. Пасля смерці маці яна тры дні ні з кім не гутарыла. Лекары сказалі, ад шоку. Быццам малады арганізм не гатовы да такога стрэсу, але маўчанне не будзе доўжыцца вечна. Так і здарылася. У адказ на крыкі дзеда, які прыехаў у горад на пахаванне, Аля выціснула з сябе ўсяго некалькі бездапаможных выкрыкаў, але цётка Ларыса, татава сястра, супакоілася, бо зразумела, што Аля не страціла свой голас канчаткова.

Дзед не ведаў, што мама хварэла на рак. Сама маці даведалася пра гэта ўсяго тры месяцы таму і папрасіла Алю ні ў якім разе не расказваць дзеду аб гэтым.

— Не хвалюйся. Мне зробяць аперацыю, прайду хіміятэрапію і зноў стану як агурочак, а дзядулю няма чаго лішні раз хваляваць, у яго і сваіх клопатаў хапае.

Аля не стала спрачацца, хоць звычайна заўсёды лаялася з мамай і паступала па-свойму. Калючы боль прабіраўся да горла. Ну чаму яна вырашыла быць паслухмянай дзяўчынкай у самы горшы момант? З-за яе дзед Мікіта нават не паспеў развітацца з мамай.

Пакуль цётка Ларыса і некалькі мамчыных сяброўак выбіралі труну, абзвоньвалі сяброў сям'і і дамаўляліся са святаром пра адпяванне, Аля хавалася ў сваім пакоі. Яна не хацела ехаць на пахаванне і ўдыхаць пах кадзіла, ад якога кружылася галава,

выслухоўваць тысячу тостаў ад ледзь знаёмых людзей і цярпець надакучлівую балбатню цёткі Ларысы ў сябе пад вухам. Алю ванітавала ад уласнай кватэры, таму дзед забраў яе на месяц у вёску.

Аля не была выдатніцай, якой лёгка даравалі прагулы па сямейных прычынах, але і яе настаўніца не была бессардэчнай ведзьмай. Яна толькі папрасіла не забываць ангельскую мову і матэматыку — два прадметы, з якімі ў Алі ўсё ішло не занадта добра. Ёй больш падабаліся біялогія ды геаграфія. Дзед Мікіта, які не ведаў ніводнага слова па-ангельску, запэўніў настаўніцу, што абавязкова будзе займацца з унучкай.

Дзед Мікіта вывез яе з Мінска на старых жоўтых «жыгулях» пад крыкі цёткі Ларысы:

— Маладую дзяўчынку ў такое сяло! Без сяброў і электрычнасці. Лепш бы сядзела з маімі хлопцамі дома і глядзела серыялы.

Дзед нахмурыў сівыя бровы і незадаволена агрызнуўся:

— Вось няхай твае зомбі і глядзяць гэтае амерыканскае глупства. На вуліцы сонейка, а Ягор бледны, як ваўкалак, таму што з хаты зусім не выходзіць.

Дзед думаў, што яго перамога над цёткай Ларысай падыме Алі настрой, але Аля толькі глядзела ў пустэчу. Ёй і сапраўды не хацелася сядзець у вёсцы без інтэрнэту, але перспектыва жыць з цёткай Ларысай і яе дзецьмі палохала яшчэ больш.

— Ты ж не пакінеш мяне з ёй, калі я вярнуся? — пыталася яна дзеда па дарозе ў вёску.— Я магу жыць адна. Я ўжо ў шостым класе.

Аля ўсё прадумала. Яна папросіць суседзяў дапамагчы з аплатай святла і інтэрнэту, навучыцца гатаваць іншыя стравы акрамя пельменяў і яечні, пачне сама прыбірацца на кухні, у гасцінай і ваннай. Але дзед Мікіта маўчаў, і Аля разумела, што ён яшчэ нічога не вырашыў. Пераезд да цёткі здаваўся ёй самым страшным пакараннем, але і заставацца ў дрымучым лесе не вельмі хацелася. Дзед, зразумела, не збіраўся кідаць любімы куток і ехаць у горад дзеля Алі. Яны ніколі не былі занадта блізкія. У дзяцінстве Аля бывала ў дзеда толькі падчас летніх канікул, а потым і зусім перастала ездзіць у вёску. Пасля разводу маці была занятая тым, каб даказаць бацьку: ёй не патрэбныя яго грошы. У яе не засталося часу ні на якія паездкі. І хоць тата працягваў пасылаць Алі грошы, мама ўсё роўна не збіралася звальняцца ні з адной з дзвюх прац. Адпускаць Алю да дзеда ў адзіночку яна баялася, таму што Аля магла заблукаць. Аднойчы мама спрабавала перавезці дзеда ў горад, але той з бурчаннем пражыў у Мінску некалькі тыдняў, пасварыўся з маці і вярнуўся ў сваё Буслава.

Тата ўжо год не быў у Беларусі. Разам з новай сяброўкай ён матаўся па Азіі, але не забываў дасылаць Алі фатаграфіі даўгахвостых малпаў, рэдкіх раслін і пясчаных пляжаў, распавядаць пра дзіўныя будысцкія храмы, палохаць яе гісторыямі пра тое, як ён згубіўся на самай бруднай вуліцы ў Індыі і ледзь не трапіў пад цягнік у В’етнаме. Тата абяцаў абавязкова ўзяць яе з сабой у адно з падарожжаў, калі ёй споўніцца васямнаццаць.

— Чаму я не магу паехаць з табой зараз?

— Ты ж ведаеш, я б узяў цябе з сабой на тыдзень у Тайланд, але мама супраць.

Пасля такіх размоў Аля пачынала сварыцца з маці, якая лічыла, што тата падае ёй дрэнны прыклад, і забараняла размаўляць з ім больш аднаго разу на тыдзень.

— Ды лепш бы я жыла з татам на вуліцы, чым з табой у гэтай дурной кватэры! — абуралася Аля, чым даводзіла маці да істэрыкі.

Раней Аля спадзявалася, што тата здолее назаўжды забраць яе з Беларусі, але зразумела: маці не здасца. Яна ўчапілася ў Алю, як драпежныя кошкі ў здабычу, знойдзеную пасярод засушлівага стэпу.

— З глузду з’ехала? Пакуль ты жывеш у гэтым доме, ты будзеш прытрымлівацца маіх правілаў. Ніякіх паездак у гэтыя трушчобы! Я не збіраюся падпісваць ніякі дазвол! Не падабаецца ў горадзе? Едзь да дзядулі ў вёску.

— І што мне там рабіць? Хадзіць з ім на паляванне?

# СВЯТЛАНА ТАРАСЕВІЧ



## Нявыказаная праўда

Паэма

Тарасевіч Святлана нарадзілася 3 мая 2007 года ў Мінску. Навучэнка ліцэя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Дыпламант літаратурных конкурсаў «Адрасы роднага слова», «Кветкі з чужых палёў», «Ах словы, чароўныя словы...». Друкавалася ў газетах «Рукі» і «Літаратура і мастацтва».

Смяюцца праз вокны яскравыя кветкі,
Пра кожную складзены песні здаўна.
Ты бачыш, у цені заснулі палеткі
І дзіўная кветка сумуе адна.

✦

У горадзе дальнім, на беразе мора,
Дзе ў сцёках чароўная б'ецца вада,
Стаіць непрыступны, у даўнім уборы
Куток, дзе прытулак займела бяда.
Атручаны замак бязлітасным ценем,
Ёсць ён і ёсць цемра — зняволенне ўдвух.
Аздобіла цьма яго змрочным адзеннем.
Вакол жа — жыццё і яго хуткі рух.
Ён мёртвы, ды толькі стаіць між жывых,
Бы вечнасці помнік за боль і пакуты,
За веліч і горыч здзяйсненняў былых.
Тут вее паўсюдна слядамі атруты.
Так смерць не набудзе прыкметы жыцця:
Луналі і ў замку пачуцці, бы здані,
Той час быў імгненнем, змяніў ход быцця —
Складаюць дагэтуль легенды, паданні.
Стагоддзі мінулі бясследна, знікалі,
Як кветкі з палёў, сярод горада людзі,
І толькі шурпатыя сцены схавалі
Дух постаці, што раз паверыла ў цуды.

✦

Самота павольна з'ядае знутры,
Але прытупіўся з гадамі мой боль.
Я стаўся ахвярай сваёй жа гульні,
Дзе правіл няма, страх трымае кантроль.
Пагляд страшна кінуць на чорнае люстра:
У ім бачу постаць агіднай пачвары,
Душа пала ў змрок,
замест сэрца там пустка.
Нянавісць мая так і хоча расправы.
Ратуе ажно самаробная маска —
За ёй адыходзіць праз знешнасць
мой страх.
Так смешна... Пужаюцца нават і краскі,
Як толькі пабачаць у вокнах мой стан.

# АНДРЭЙ СІДАРЭЙКА



## Крама

Сацыяльна-сатырычная аповесць

Сідарэйка Андрэй нарадзіўся 16 студзеня 1985 года ў вёсцы Каравацічы Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці. Скончыў Лоеўскае педагагічнае вучылішча і факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Аўтар кніг «Жонка на гадзіну», «Вальс чырвоных гронак рабін», «Дзесяць капеек», «Здарэнне ў ціхую ноч», кнігі гумару «Хабар» і шматлікіх публікацый у беларускай літаратурна-мастацкай перыёдыцы («Вожык», «Маладосць», «ЛіМ», «Полымя»). Прызёр конкурсу апавяданняў газеты «Звязда».

### Частка першая. Нечаканая камандзіроўка

### За хлебам

Намеснік начальніка кіравання гандлю і паслуг рэгіёна Мікалай Мікалаевіч Кудзелькін вярнуўся дадому з працы. Як заўсёды вечарам, ён збіраўся распранупца, памыць рукі з мылам, пасля чаго юркнуць на кухню, дзе яго ўжо чакала вячэра, але звычайны распарадак парушыла жонка. Яна папрасіла:

— Міколка, схадзі, калі ласка, у краму. Ведаеш, сёння наша памочніца Райка захварэла, прыйсці не змагла, а ў нас дома нават хлеба няма.

— Аля, я?! — здзівіўся Кудзелькін.— Ты ведаеш, колькі я ў тых крамах не быў?! Па працы і то іншыя ходзяць з праверкамі, а потым дакладваюць.

— А цяпер ты не на працы, а дома,— міралюбіва прамовіла жанчына.— Ты можаш нікуды не ісці, але тады табе прыйдзецца есці свой любімы боршч без хлеба. Схадзіць магла б і я, але толькі ўправілася з вячэрай і хачу адпачыць.

Кудзелькіну ісці нікуды не хацелася. Тым больш у краму. Але які ж боршч без хлеба? Крыху павагаўшыся, ён пагадзіўся.

— Ну, добра. Схаджу.

І тут жа зноў быў прыпынены жонкай:

— Куды ты так хутка? Пачакай. Вось, я спіс прыгатавала, што трэба набыць.

Кудзелькін узяў спіс, зірнуў у яго і... спалохаўся. Акрамя хлеба, там быў яшчэ з дзясятак прадуктаў, якія неабходна было купіць.

— Гэта называецца «за хлебам»? — перапытаў ён.

— Так,— адказала жонка.— Райка так «за хлебам» амаль штодня ходзіць. Ці ты думаеш, на стале вячэра і сняданак самі па сабе з'яўляюцца?

Кудзелькін нічога не адказаў. Засунуўшы цыдулку ў кішэню курткі, выйшаў з кватэры.

У краме, нягледзячы на позні вечар, было шмат людзей.

«Таксама пасля працы «за хлебам» зайшлі»,— падумаў Кудзелькін.

Доўга хадзіў па краме, шукаў неабходныя прадукты, што былі ў спісе. Ніяк не мог знайсці прыправу для баршчу. Звярнуўся да прадаўца, якая абслугоўвала іншага пакупніка.

— Мужчына, у мяне не тысяча рук, каб кожнаму дапамагчы,— нервова адказала прадавец.— Пачакайце.

Прыйшлося чакаць. Пасля чаго прадавец з незадавальненнем правяла Кудзелькіна да патрэбнай паліцы.

— Здаецца, крама невялікая. А ўсе нібы з месяца зваліліся. У лес трапілі. За ручку кожнага трэба вадзіць,— праз імгненне гаварыла жанчына калезе.

На пачутае Кудзелькін ніяк не адрэагаваў. Нарэшце ён знайшоў усё неабходнае і рушыў да кас. У гэты час з пяці кас працавалі толькі дзве. Да іх ужо стаялі вялікія чэргі.

«А што з астатнімі?» — падумаў чыноўнік. Відаць, так думалі і іншыя.

— Чаму ў вас толькі дзве касы працуе? — прамовіў услых адзін з наведвальнікаў.

— Тэхнічны перапынак,— адказала адна з касірак.

— Вам пакет трэба? Колькі можна пытацца? — нарэшце пачуў Кудзелькін зварот да сябе. На працы да яго звярталіся па-іншаму, таму і не пачуў.

— Ага, трэба,— прамовіў чыноўнік.

— Не чуюць нічога, а потым скардзяцца на маруднае абслугоўванне,— незадаволена буркнула другая касірка, каб падтрымаць калегу.

— З вас семдзесят рублёў,— агучыла суму супрацоўніца крамы.

— Колькі?! — не паверыў сваім вушам Кудзелькін.

— Семдзесят,— паўтарыла жанчына.

— За гэта?! — перапытаў Кудзелькін і прыўзняў пакет.— Гэта рабаванне! Тут амаль сацыяльныя прадукты. У нас заканадаўствам устаноўлены кошт,— наменклатурнай прафесійнай мовай хацеў адстаяць сябе мужчына.

— Не затрымлівайце чаргу, разлічвайцеся,— пачуў Кудзелькін незадаволены голас жанчыны, што стаяла ў чарзе за ім.— Прывыклі, што жонкі ходзяць за прадуктамі. Зусім кошту не ведаюць. Толькі заканадаўства, дзякуючы тэлевізійным навінам!

— Пішыце тым, хто ў кабінетах сядзіць. Цэны рэгулюе,— пачулася яшчэ адна рэпліка з чаргі.

— Вы аплачваць будзеце? Ці ахову клікаць? — стомленым голасам запыталася касірка.

— Ага, зараз,— прамовіў Кудзелькін і палез у кішэню за грашыма, калі ўбачыў, што да касы накіраваўся ахоўнік.

Апетыт знік. Баршчу не хацелася — проста адпачыць. Паход у краму адняў столькі моцы! Здаецца, і на працы так не змарыўся, колькі ў краме.

— Аля, ты ведаеш, колькі каштуе твой «хлеб»? — запытаўся муж.

— Ведаю,— адказала жонка, не адрываючы позірку ад тэлеэкрана.

— А ці ведаюць у кіраванні? Заўтра пацікаўлюся дзеля забавы.

— Вы, відаць, толькі і забаўляецеся на працы,— іранічна прамовіла жонка.

— Ну што ты! — не пагадзіўся Кудзелькін, які таксама не пачуў іроніі.— За што ж мне грошы тады плацяць?

Кудзелькін хацеў сказаць, што, маўляў, не задарма ж ён зарплату атрымлівае. Але было ўжо позна.

— За што вы там у сваіх кабінетах грошы атрымліваеце, хочуць ведаць многія. Калі б ты не быў маім мужам, я таксама б, напэўна, так думала,— адказала Аля, а потым дадала: — Хопіць пра краму. На, вось лепш газету пачытай. На пятай старонцы цікавы артыкул пад рубрыкай «Журналіст змяняе прафесію». Карэспандэнт тыдзень сантэхнікам у ЖКГ працаваў, каб зразумець, што гэта за праца такая і чаму так доўга прыходзіцца чакаць рамонт. Можа, калі б хто з вашых схадзіў на тыдзень у краму папрацаваць, то зразумеў бы, чаму столькі каштуе хлеб.

# РАГНЕД МАЛАХОЎСКІ



## Пацалункі на фоне Нарачы

Вершы

Малахоўскі Рагнед нарадзіўся 5 верасня 1984 года ў пасёлку Сяймчан Магаданскай вобласці (Расія). З 1987 года жыве ў Беларусі. Скончыў факультэт фінансаў і банкаўскай справы Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта і Інстытут дзяржаўнай службы Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Працаваў у часопісах «Полымя», «Маладосць», «Бярозка», «Вожык». Цяпер — у Мінскім абласным аддзяленні Саюза пісьменнікаў Беларусі.
Вершы і пераклады друкаваліся ў шматлікіх рэспубліканскіх выданнях, калектыўных зборніках і анталогіях. Піша музыку, займаецца фотамастацтвам. Аўтар кніг паэзіі «Беражніца», «У дзённай мітусні», «Жыві!». Лаўрэат Мінскай абласной прэміі ў галіне літаратуры і Рэспубліканскага конкурсу імя Міколы Мятліцкага. Узнагароджаны дыпломам ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі» за «вялікі ўклад у развіццё культуры і літаратуры Беларусі».

### Хваляванні

Асцярожна раздзімаю
безжыццёвы попел
пражытых хвілін,
пераражытых імгненняў,
перароджаных падзей...
Ён хаатычна пакідае маё жыццё,
растварaецца ў сусвеце,
у вечнасці, у бясконцасці...
А ў памяці застаецца ірдзець
чыстае, але агрубелае вуголле.
Калі ўзварушыць
гэта распаленае цяпельца,
накіраваць на яго
жывыя хвалі ўспамінаў —
народзяцца хваляванні.

Заплюшчваю вочы і адчуваю,
як непаседлівы вільготны вецер
па люстэрку маёй роднай Нарачы
гоніць з-за імглістага далягляду
чароды ўзбуджаных,
але пакорлівых першых хваляў.
Яны дурэюць, як дзеці,
радасна набягаюць адна на адну,
спрачаюцца і мірацца,
спаборнічаюць і аб’ядноўваюцца,
а пасля разбіваюцца
на тысячы імклівых кропель
аб прывязаныя рыбацкія чоўны
і доўгачаканы бераг.
«Шкада мне вас, шэрыя хвалі,
шкада ўсёй душой надарванай,
усім сэрцам, ужо апусцелым:
вы ж — родныя сёстры мае!»[1]

[1] З Максіма Багдановіча.

✦ ✦ ✦

Што ж так цяжка ляцець нам да зор?
Шчэ зямныя не спеты ўсе песні.
РастBараецца вогненны ўзор,
Галавешачка ў полымі трэсне...

Танчаць зоры. Чамусьці яны —
Як з юнацтва майго палюбоўніцы.
Палюбоўніцы і кажаны
Любяць ноч даастатку, напоўніцу.

І напоўніцца ранак цяплом.
Так імгненна ўся ноч праляцела.
Узмахну над мінулым крылом —
І ў дзень новы — адчайна і смела.

Дзе шляхі не зварочвалі ўбок,
Нечаканасцей звонкія крокі...
Над сівой галавешкай — дымок,
Бы ўспаміны аб чымсьці далёкім...

## Пацалункі на фоне Нарачы

Маладзік у завоблачнай воўне
Не згасаў. Так нас ноч сустракала.
Маладосць калыхалася ў чоўне
І па хвалях жыццёвых імчала.

Разнявольваў скаваныя думкі,
У пачуццях святых блукаючы.
Я табе прысвячаў пацалункі.
Пацалункі на фоне Нарачы.

І здавалася, ў гэтай пяшчоце
Усёй вечнасці можна сагрэцца.
Чарацянкі спявалі ў чароце —
Абнадзейвалі шчырае сэрца.

Праплываюць гады, быццам чоўны.
Ноч ці дзень — не маўчаць чарацянкі.
Пацалункі, ўспамінамі поўныя,
Ўсё ярчэй, як юнацтва заранкі.

✦ ✦ ✦

Стаю пад раем на краі вады.
Адлюстраванне берагоў не адчувае.
Зямля аблашчана вадой.
Пад раем — край.
Камусьці тут жыццё — прамая каляіна,
Але ж для большасці — суцэльны вір,
Выпрабаванне на трываласць
Перад смерцю.
Ад краю адыду...
Блішчаць аблокі ў праменні раю.
Дажджу не бачна,
Толькі чутныя ледзь-ледзь
Грымотаў насцярожаныя крокі
На мяжы паміж зямлёй,
Аблокамі і раем.
Я разумею:
Край мой пачынаецца
На ўскрайку незлічонае вады.

## Выбух

Быў выбух гарачай крыві. Пералом.
Калі пасля здрады прынёс табе кветкі.
Удзень напаўнялася цела святлом,
А ўноч паміралі нервовыя клеткі.

І больш не адродзіцца ўсё, што было.
Мы разам зрабілі такія высновы.
Няма апраўданняў. Смяялася зло.
І сам я не верыў ва ўласныя словы.

Быў выбух гарачай крыві. Эпілог
Майго існавання ад ночы да рання.
Ударам пад дых мяне перамагло
Знянацкае самазнішчэнне кахання.

✦ ✦ ✦

Святая ноч хавае твар за небакраем,
Нібы саромеецца ў вочы зазірнуць
Паэту маладому, што жадае
Пад зорным небам сэрца музы закрануць.

Ён не дарэмна папрасіў спагады ў лёсу:
Даўно ў палоне супярэчлівасці дум.
Паэт акіне позіркам нябёсы,
Схавае ў вечным забыцці няўмольны сум.

Святая ноч пакіне знакі на аблоках...
І невымоўная абудзіцца душа
Паэзіі, каб узляцець высока —
У промнях думак аж да зорнага каўша.



# АНДРЭЙ ПІЧУШКІН

## $20^{th}$ century boy, ці Мастак у пошуках сэнсаў і сябе

*Калі размаўляеш з маладым мастаком, вельмі страшна ўпасці ў крайнасці: стаць на бок «кансерватараў» і панура пытацца, ці можа ён так, як Рэпін, ці размаўляць на тэму Instagram, TikTok і NFT-мастацтва, тым самым цалкам страціўшы цікавасць больш дарослай аўдыторыі. Аднак мы стараемся вытрымаць тонкую грань разумення і захопленасці. І інтэрв'юер раз за разам задае пытанні, якія могуць здацца дурнымі і банальнымі, у надзеі атрымаць разумны і эксклюзіўны адказ. Якое шчасце, што сёння яго надзеі не аказваюцца марнымі!*

*Андрэй Пічушкін нашым чытачам ужо знаёмы: яго карціны з'явіліся на вокладцы часопіса «Маладосць» у трэцім нумары гэтага года. Гутарка атрымалася вельмі грунтоўная і сур'ёзная, а яшчэ раскрыла як асобу не толькі канкрэтнага мастака, але і вялікі зрэз беларускай таленавітай моладзі (хай Андрэй і адмаўляўся гаварыць «за ўсіх»). Як выбраць свой шлях? Як не паддацца ўплыву грамадскасці? Ці можа чалавек мастацтва выжываць без сацыяльных сетак? І як захаваць у сабе шчасце і натхненне, калі падпісчыкі ставяць падабайкі не на карціны, а на каханую?*

### Як становяцца мастакамі?

● ***— Калі пачалося ваша захапленне маляваннем?***

● — У мяне мастацкая сям'я. Мама знайшла сябе ў дызайне, скончыла Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў. І мяне ўсё дзяцінства атачалі яе сябры, такія ж творчыя і свабодныя людзі. Калі быў зусім маленькім, чытаў не казкі, а кніжкі па мастацтве. Асабліва добра памятаю любімую сваю кнігу «Мастацтва XX стагоддзя» ў цёмна-сіняй вокладцы з яркім квадрацікам у цэнтры. Вядома, вельмі малы працэнт тэксту быў даступны майму разуменню, але карцінкі былі прыгожымі, я мог разглядаць іх гадзінамі. Таксама не мог расстацца з алоўкамі. Пастаянна адлюстроўваў герояў мульцікаў, спрабаваў маляваць коміксы (зрэшты, спрабую да гэтага часу, але ўсё ніяк не атрымліваецца), як і кожнае прыстойнае дзіця, выяўляў сваю мастацкасць на шпалерах. Адзін раз, пакуль тата спаў, размаляваў яго: сонейка на пупку, танкі на нагах, нейкія чалавечкі па целе... Сям'я прыняла рашэнне, што трэба паспрабаваць адразу паступаць у мастацкую школу. Але мама хацела пахадзіць яшчэ і ў іншыя навучальныя ўстановы, каб выбраць лепшую. Толькі са мной такі трук не спрацаваў. Мы заходзілі ў чарговую школу, я задаваў тэхнічцы пытанне: «Цётачка, а тут малююць?» Яна адказвала адмоўна, я разварочваўся і сыходзіў. Так мама канчаткова здалася, і я аж да 9 класа вучыўся ў СШ № 19 г. Гомеля.

● ***— Чаму пасля заканчэння школы вырашылі застацца вучыцца ў Гомелі?***

● — Гомельскі дзяржаўны мастацкі каледж мае даволі багатую гісторыю. Пер-




20th century boy. Палатно, алей, акрыл. 2022

шапачаткова адкрываўся як філіял Мінскага мастацкага вучылішча імя А. К. Глебава. Я ведаў, што там добрыя выкладчыкі і камфортная атмасфера. Шмат мінскіх мастакоў, якія заваявалі папулярнасць і любоў публікі, былі яго выпускнікамі. І ў самім каледжы дзіўным чынам захаваўся дух свабоды і самавыяўлення. І выкладчыкі, і студэнты рабілі ўсё магчымае, і гэта давала вынік. Мне падалося, што каледж будзе лепшым выбарам.

● — ***Так і атрымалася?***

● — Так і атрымалася! Першапачаткова я хацеў паступаць на спецыяльнасць «дызайн», чамусьці быў упэўнены ў гэтым кірунку. А потым, калі быў на падрыхтоўчых курсах, трапіў у клас жывапісу. Да гэтага часу памятаю пах алейных фарбаў, творчы хаос, які ўсё ж быў парадкам. Усюды палотны, эскізы, пэндзлікі... Тады вырашыў, што на дызайн мне, уласна, не вельмі і трэба. Зрэшты, ужо падчас вучобы і пасля яе падпрацоўваць дызайнерам перыядычна даводзілася.

● — ***Чым вы займаліся пасля заканчэння каледжа?***

● — Я збіраўся паступіць у Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў. Быў упэўнены, што ўсё атрымаецца, мае карціны хвалілі і сябры, і выкладчыкі, таму месца для размеркавання не шукаў з нейкай асаблівай стараннасцю. З-за высокага сярэдняга бала мне далі самому выбраць, дзе я хачу знаходзіцца бліжэйшыя два гады, і я, упэўнены ў будучыні, проста наўздагад тыцнуў у Гомельскі абласны цэнтр народнай творчасці, бо знаходзіўся ён у цэнтры. У акадэмію я не паступіў, што было даволі дзіўна. Дагэтуль не разумею, як так выйшла. Мае карціны з конкурсаў забралі ў фонд, значыць, яны спадабаліся. У момант, калі зразумеў, што ўсе мае планы руйнуюцца, знерваваўся і раззлаваўся. Думаў: «Ну хоць падрамнікі можна забраць?» Нельга было... У другі год я таксама не паступіў. Расчаравання не было, але я губляў веру ў тое, што мой шлях — верны. Мне здавалася, што я памыліўся з выбарам прафесіі, што я нічога не каштую.

● — ***Але трэці раз паступаць не пайшлі?***

● — Я зразумеў, што за тыя гады, што вучыўся б у акадэміі, зрабіў бы нашмат менш. Увесь мой час сыходзіў бы на вучобу, на выкананне праектаў, якія павінны строга падпарадкоўвацца законам акадэмічных нормаў. Я ж быў вольны. Эксперыментаваў, спрабаваў новае, рызыкаваў... Праца ў Гомельскім абласным цэнтры народнай творчасці стала вельмі цікавым вопытам. Я арганізоўваў гарадскія мерапрыемствы, у тым ліку і Дажынкі.